Распрацавана навукова-даследчым аддзелам бібліяграфіі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, 2020 г.; адобрана Саветам бібліятэк Беларусі па інфармацыйным узаемадзеянні, 21 кастрычніка 2020 г.; зацверджана Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй на VI Форуме бібліятэкараў Беларусі, 28 мая 2021 г., г. Мінск

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Старшыня Савета Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі
Кулажанка У.Г.
__________2021

# ПАЛАЖЭННЕ АБ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Палажэнне вызначае мэту і задачы краязнаўчай бібліятэчнай дзейнасці, яе арганізацыйныя прынцыпы, разглядае пытанні фарміравання і захавання краязнаўчых фондаў, каталагізацыі краязнаўчых і мясцовых дакументаў, бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання, стварэння інфармацыйнай прадукцыі, метадычнага забеспячэння, навукова-даследчай і праектнай дзейнасці ў галіне краязнаўства, распаўсюджвання і папулярызацыі краязнаўчых ведаў.

1.2. Асноўныя тэрміны і азначэнні:

*абласная бібліятэка* – універсальная навуковая бібліятэка, якая выконвае функцыі бібліятэчнага абслугоўвання і рэгіянальнага каардынацыйнага навукова-метадычнага цэнтра для ўсіх бібліятэк вобласці;

*аддалены доступ* – доступ да праграм і даных з аддаленага тэрмінала праз каналы і сродкі сувязі;

*база даных* (далей – БД) – сукупнасць структураванай і ўзаемазвязанай інфармацыі, арганізаванай па пэўных правілах на матэрыяльных носьбітах;

*базавая арганізацыя* – арганізацыя, якая ажыццяўляе каардынацыю і метадычнае кіраўніцтва фарміравання карпаратыўнага інфармацыйнага рэсурсу;

*беларусазнаўства* – навуковая дысцыпліна і вобласць практычнай дзейнасці па вывучэнні і распаўсюджванні ведаў аб адметнасцях і агульнасці беларусаў, іх нацыянальным руху, узаемаадносінах з суседзямі, мове, літаратуры, гісторыі, культуры, этнаграфіі, эканоміцы, фальклоры, мастацтве і інш.

*беларусіка* − сукупнасць дакументаў, якія па моўнай, аўтарскай і

змястоўнай прыметах адносяцца да Беларусі, але створаны за яе межамі;

*бібліяграфічная інфармацыя* – інфармацыя пра дакументы, неабходная для іх ідэнтыфікацыі і выкарыстання;

*бібліяграфічнае апісанне* – сукупнасць звестак пра дакумент, прыведзеных па ўстаноўленых правілах;

*бібліяграфічны запіс* – элемент (кампанент) бібліяграфічнай інфармацыі, у якім зафіксаваны звесткі пра дакумент, дазваляючыя яго ідэнтыфікаваць, раскрыць яго склад і змест у мэтах бібліяграфічнага пошуку;

*бібліяграфічны рэпертуар* – масіў бібліяграфічнай інфармацыі, які максімальна поўна адлюстроўвае дакументы краіны/рэгіёна за пэўны храналагічны перыяд, незалежна ад месца захоўвання;

*бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне* – сукупнасць розных відаў дзейнасці бібліятэкі па задавальненні патрэб яе карыстальнікаў шляхам прадастаўлення бібліятэчных і бібліяграфічных паслуг;

*бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства* – вобласць бібліятэчнай дзейнасці, скіраваная на задавальненне краязнаўчых патрэб грамадства бібліяграфічнымі сродкамі;

*бібліятэчнае краязнаўства* – вобласць бібліятэчнай дзейнасці, скіраваная на задавальненне краязнаўчых патрэб грамадства сродкамі бібліятэк;

*бібліятэчная паслуга* – канкрэтны вынік бібліятэчнага абслугоўвання, які задавальняе пэўную патрэбнасць карыстальніка бібліятэкі (выдачу дакументаў, прадастаўленне доступу да інфармацыі, даведкі, кансультацыі і інш.);

*бібліятэчны каталог* – адна з асноўных частак даведачна-бібліяграфічнага апарата, якая раскрывае склад і (або) змест бібліятэчных фондаў;

*блог* – вэб-старонка, якая забяспечвае бесперапынную публікацыю вэб-спасылак і/ці каментарыяў па канкрэтнай тэме або прадмеце, часта ў выглядзе кароткіх запісаў, размешчаных у зваротным храналагічным парадку;

*выданне* – паліграфічна аформлены дакумент, які прайшоў рэдакцыйна-выдавецкую апрацоўку, мае ўстаноўленыя выдавецкія звесткі і прызначаны для перадачы змешчанай у ім інфармацыі;

*вэб-сайт* – месца размяшчэння інфармацыйнага рэсурса ў інтэрнэце;

*гісторыка-культурная спадчына* – сукупнасць каштоўнасцей, якія чалавецтва атрымала ад мінулых культурных эпох, крытычна засвоіла, падтрымлівае і выкарыстоўвае ў кантэксце канкрэтна-гістарычных задач

сучаснасці;

*даведачна-бібліяграфічны апарат* – сукупнасць даведачных і бібліяграфічных выданняў, бібліятэчных каталогаў і картатэк, якія прызначаюцца для пошуку інфармацыі;

*дакумент* (дакументаваная інфармацыя) – зафіксаваная на матэрыяльным носьбіце інфармацыя з рэквізітамі, якія дазваляюць яе ідэнтыфікаваць;

*зводны электронны каталог* – машыначытальны бібліятэчны каталог, які адлюстроўвае фонды некалькіх самастойных бібліятэк ці бібліятэчнай сеткі рэгіёна/краіны;

*інфармацыйна-пошукавая сістэма* – сукупнасць інфармацыйна-пошукавага масіву, інфармацыйна-пошукавай мовы, правіл яе выкарыстання, тэхнічных сродкаў, прызначаная для інфармацыйнага пошуку;

*інфармацыйны рэсурс* – арганізаваная сукупнасць дакументаванай інфармацыі, якая ўключае базы даных, іншыя сукупнасці ўзаемазвязанай інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах;

*інфармацыя* – звесткі аб асобах, прадметах, фактах, падзеях, з’явах і працэсах незалежна ад формы іх прадстаўлення;

*кантэнт* – інфармацыйнае напаўненне (тэксты, графіка, мультымедыя) інфармацыйнага рэсурсу;

*карыстальнік бібліятэкі* (чытач, абанент, наведвальнік мерапрыемства) – фізічная (індывідуальны карыстальнік) ці юрыдычная (калектыўны карыстальнік) асоба, якая звяртаецца ў біблітэку за бібліятэчнымі паслугамі;

*карыстальнік (спажывец) інфармацыі* – суб’ект, які звяртаецца да крыніцы інфармацыі, інфармацыйнай сістэмы або пасрэдніка за атрыманнем неабходнай яму інфармацыі і карыстаецца ёю ў адпаведнасці з парадкам, устаноўленым уласнікам або ўладальнікам інфармацыі;

*каталог мясцовых выданняў* – бібліятэчны каталог выданняў, створаных на пэўнай тэрыторыі, незалежна ад іх тэматыкі;

*край* – канкрэтная частка дзяржавы, якая звычайна супадае з адзінкай сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення (вобласць, раён, горад) і вызначаецца з улікам змяненняў гістарычных межаў, а таксама фізіка-геаграфічных, прыродна-кліматычных, геалагічных, эканамічных і іншых крытэрыяў раяніравання; тэрыторыя, якую даследуе краязнавец;

*краязнаўства* – 1) грамадскі рух і комплексная навуковая дысцыпліна, аб’ектам пазнання якіх з’яўляюцца асобныя рэгіёны,

населеныя пункты ў межах краіны; 2) вывучэнне на навуковай аснове гістарычных, палітычных, сацыяльна-эканамічных, геаграфічных, культурных, прыродных і шэрагу іншых фактараў, якія характарызуюць у комплексе фарміраванне і развіццё тэрытарыяльнай адзінкі краіны;

*краязнаўчае выданне* – дакумент, які з'яўляецца крыніцай інфармацыі аб пэўным рэгіёне ці населеным пункце, раскрывае гісторыю краю (мясцовасці), характарызуе вядомых яго прадстаўнікоў, перспектывы развіцця краю і іншыя звесткі аб ім;

*краязнаўчая бібліяграфія* – від бібліяграфіі, задачай якога з'яўляецца падрыхтоўка і распаўсюджванне бібліяграфічнай інфармацыі, звязанай з канкрэтнай мясцовасцю краіны;

*краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі* – вобласць навукова-практычнай дзейнасці бібліятэкі па пошуку, збору, захаванні і прадастаўленні ў грамадскае карыстанне краязнаўчых дакументаў, а таксама інфармацыі аб іх;

*краязнаўчая літаратура* – сукупнасць усіх магчымых відаў друкаванай прадукцыі (кнігі, зборнікі, перыядычныя выданні, ноты, выяўленчая і картаграфічная прадукцыя і інш.), якія адносяцца да мясцовага краю па змесце, незалежна ад месца выдання і друку;

*краязнаўчы бібліяграфічны дапаможнік* – бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы аб пэўнай мясцовасці краіны;

*краязнаўчы дакумент* – дакумент, які цалкам прысвечаны пэўнаму краю (рэгіёну, тэрыторыі) або змяшчае значныя па аб'ёме ці каштоўнасці звесткі аб ім;

*краязнаўчы каталог/краязнаўчая картатэка* – інфармацыйна-пошукавая сістэма, якая адлюстроўвае інфармацыю аб дакументах краязнаўчага характару;

*краязнаўчы фонд* – сістэматызаванае мноства зафіксаваных у дакументальнай форме звестак аб краі; частка бібліятэчнага фонду, у якой сабраны дакументы, звязаныя зместам, аўтарствам ці паходжаннем з пэўным краем;

*лакальны электронны каталог* – машыначытальны бібліятэчны каталог, які працуе ў рэальным рэжыме часу і прадастаўлены ў распараджэнне карыстальнікаў у лакальнай вылічальнай сетцы бібліятэкі;

*мадэляванне фонду* – узнаўленне ці вызначэнне пры дапамозе мадэляў якасцей і параметраў бібліятэчнага фонду з мэтай іх даследавання і наступнай аптымізацыі;

*мясцовы дакумент* – усе выданні, неапублікаваныя і аўдыявізуальныя матэрыялы, машыначытальныя носьбіты інфармацыі,

створаныя на тэрыторыі краю;

*навукова-даследчая работа* – работа навуковага характару, звязаная з навуковым пошукам, правядзеннем даследаванняў, эксперыментамі ў мэтах атрымання і пашырэння ведаў, праверкі навуковых гіпотэз, устанаўлення заканамернасцяў, навуковых абагульненняў, навуковага абгрунтавання праектаў;

*нацыянальная бібліяграфія* – інфармацыйная інфраструктура, якая забяспечвае падрыхтоўку, распаўсюджванне і выкарыстанне ўніверсальнай бібліяграфічнай інфармацыі аб дакументах якой-небудзь краіны/нацыі;

*нацыянальны дакумент* – дакумент, які па тэрытарыяльнай, моўнай, аўтарскай, змястоўнай прыметах адносіцца да якой-небудзь дзяржавы/нацыі і ўяўляе для яе выключную каштоўнасць як гісторыка-культурная з’ява;

*публічная бібліятэка* – агульнадаступная бібліятэка, якая прызначана для задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей шырокіх колаў насельніцтва;

*радзімазнаўства* – інтэграваная дысцыпліна, якая ўключае веды па гісторыі Бацькаўшчыны, роднай мове, геаграфіі, прыродазнаўстве, літаратуры, знаёміць з багатай і самабытнай спадчынай народа, паказвае яго ролю ў сусветнай супольнасці, абуджае цікавасць да вывучэння роднага краю;

*рэгіён* – пэўная частка тэрыторыі краіны, якая мае свае эканамічныя, геаграфічныя, дэмаграфічныя асаблівасці;

*рэгіёназнаўчая інфармацыя* – сукупнасць звестак аб рэгіёне, зафіксаваных на розных носьбітах і існуючых у формах, якія дазваляюць ажыццяўляць працэсы пошуку, аналізу, сінтэзу, захоўвання і распаўсюджвання звестак аб рэгіёне;

*рэгіянальная бібліяграфія* – інфармацыя аб тэрытарыяльных аспектах палітычнага жыцця, навукі, культуры з дапамогай адлюстравання літаратуры, якая па змесце адносіцца да адпаведнага рэгіёна;

*рэгіянальная бібліятэка* – цэнтральная бібліятэка, створаная ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем краіны (абласная, раённая і інш.);

*рэгіянальны бібліяграфічны дапаможнік* – бібліяграфічны дапаможнік, які выдадзены ў канкрэтным рэгіёне і/або адлюстроўвае дакументы, што звязаны з рэгіёнам сваім паходжаннем, зместам і іншымі прыметамі;

*сістэма карпаратыўнай каталагізацыі* – аб’яднанне бібліятэк і

іншых інфармацыйных устаноў з мэтай інтэграцыі існуючых і сумеснага стварэння карпаратыўных бібліяграфічных рэсурсаў;

*цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма* (далей – ЦБС) – бібліятэчнае аб'яднанне, якое функцыянуе на аснове агульнага арганізацыйнага і тэхналагічнага адзінства;

*электроннае выданне* – электронны дакумент (група электронных дакументаў), які прайшоў рэдакцыйна-выдавецкую апрацоўку, прызначаны для распаўсюджвання ў нязменным відзе і які мае выхадныя звесткі (даныя);

*электронная бібліятэка* – размеркаваная інфармацыйная сістэма, якая змяшчае ўпарадкаваную калекцыю разнародных электронных дакументаў, забяспечаных сродкамі навігацыі і пошуку, якая забяспечвае іх захоўванне і доступ да іх праз глабальныя сеткі перадачы дадзеных у выглядзе, зручным для карыстальніка;

*электронная копія* – копія, створаная ў лічбавай форме;

*электронны дакумент* – дакумент у лічбавай форме, для выкарыстання якога неабходны сродкі вылічальнай тэхнікі ці іншыя спецыялізаваныя прыстасаванні для ўзнаўлення тэксту, гуку, выявы;

*электронны каталог* (далей – ЭК) – бібліятэчны каталог у машыначытальнай форме (працуе ў рэжыме рэальнага часу), які прадастаўлены для карыстання як у бібліятэцы, так і ў аддаленым доступе.

*электронны рэсурс* – электронныя даныя і падтрымліваючыя іх праграмна-тэхнічныя сродкі.

1.3. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк Беларусі рэгулюецца:

Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры;

іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

Палажэннем аб Савеце бібліятэк Беларусі па інфармацыйным узаемадзеянні;

лакальнымі нарматыўнымі актамі бібліятэк Рэспублікі Беларусь, у тым ліку:

Статутам дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»;

Канцэпцыяй фарміравання інфармацыйных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

## ГЛАВА 2
## МЭТА І ЗАДАЧЫ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

2.1. Краязнаўчая бібліятэчная дзейнасць – прафесійная дзейнасць,

накіраваная на задавальненне патрэб грамадства ў краязнаўчай інфармацыі сродкамі бібліятэк.

2.2. Мэтай краязнаўчай і радзімазнаўчай дзейнасці бібліятэк з'яўляецца садзейнічанне:

– сацыяльнаму, эканамічнаму, культурнаму развіццю краю;

– адраджэнню і захаванню гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны;

– усебаковаму навуковаму даследаванню краю;

– папулярызацыі ведаў аб краі;

– патрыятычнаму выхаванню.

2.3. Задачамі бібліятэк у сферы краязнаўства з'яўляюцца:

– пошук і выяўленне краязнаўчых і мясцовых дакументаў пэўнай тэрыторыі, іх збор і захаванне;

– адлюстраванне звестак аб мясцовых і краязнаўчых дакументах у інфармацыйна-пошукавых сістэмах (незалежна ад месца захоўвання дакументаў);

– інфармаванне аб краязнаўчых дакументах і абслугоўванне імі карыстальнікаў сваёй і іншых бібліятэк;

– фарміраванне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў і забеспячэнне іх даступнасці ў самім рэгіёне і за яго межамі;

– распаўсюджванне і папулярызацыя краязнаўчых ведаў;

– фарміраванне і развіццё краязнаўчых інфармацыйных патрэб.

## ГЛАВА 3
## АРГАНІЗАЦЫЯ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

3.1. З мэтай забеспячэння асноўных напрамкаў краязнаўчай дзейнасці ажыццяўляецца ўзаемадзеянне паміж бібліятэкамі рознага ўзроўню, розных сістэм і ведамстваў.

3.2. Нацыянальная бібліятэка Беларусі (далей – НББ) з'яўляецца метадычным і кансультацыйным цэнтрам для бібліятэк краіны па краязнаўчай рабоце.

3.3. Асноўныя напрамкі дзейнасці НББ у галіне беларусазнаўства і краязнаўства:

– фарміраванне фондаў нацыянальных дакументаў;

– выяўленне нацыянальных/краязнаўчых дакументаў, якія адсутнічаюць у фондах бібліятэкі, набыццё іх арыгіналаў або электронных копій;

– стварэнне лакальных і зводных электронных інфармацыйных рэсурсаў (далей – ЭІР), якія з'яўляюцца крыніцамі беларусазнаўчай і

краязнаўчай інфармацыі;

– удзел у стварэнні рэгіянальных паўнатэкставых рэсурсаў (выяўленне краязнаўчых дакументаў, іх алічбоўка);

– арганізацыя аддаленага доступу да краязнаўчай інфармацыі;

– каардынацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк краіны;

– аналіз стану краязнаўчай работы рэгіянальных бібліятэк, метадычнае, навукова-практычнае забеспячэнне па пытаннях краязнаўства, распрацоўка рэгламентуючых дакументаў;

– навукова-даследчая дзейнасць у галіне краязнаўства, ажыццяўленне навуковых праектаў па тэмах, звязаных з краязнаўствам;

– стварэнне выдавецкай прадукцыі краіназнаўчай і краязнаўчай тэматыкі;

– арганізацыя і правядзенне навукова-практычных, вытворчых, сацыякультурных мерапрыемстваў;

– удзел у павышэнні кваліфікацыі кадраў, у тым ліку па пытаннях бібліятэчнага краязнаўства.

3.4. Абласныя бібліятэкі з’яўляюцца цэнтрамі краязнаўчай дзейнасці ў сваіх рэгіёнах.

3.5. Краязнаўчая работа вядзецца ўсімі аддзеламі абласной бібліятэкі пад агульным кіраўніцтвам дырэктара ці яго намеснікаў. Цэнтрам краязнаўчай работы з’яўляецца спецыялізаванае структурнае падраздзяленне (аддзел краязнаўства/краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ці сектар у складзе інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела).

3.6. У галіне бібліятэчнага краязнаўства абласная бібліятэка выконвае функцыі:

– галоўнага сховішча краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў вобласці (імкнецца да якаснага фарміравання фондаў, якія павінны задавальняць разнастайныя інфармацыйныя патрэбы насельніцтва рэгіёна, у тым ліку ў краязнаўчай інфармацыі, гэтым самым прымае ўдзел у фарміраванні і захаванні сукупнага нацыянальнага бібліятэчнага фонду);

– установы, якая здзяйсняе бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне краязнаўчай інфармацыяй (прадастаўляе доступ як да саміх краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, так і да бібліяграфічнай і аўтарытэтнай інфармацыі аб іх; ажыццяўляе бібліяграфічнае абслугоўванне па запытах краязнаўчага характару і кансультацыйную дапамогу ў выкарыстанні крыніц краязнаўчай інфармацыі);

– рэгіянальнага бібліяграфічнага цэнтра (удзельнічае ў стварэнні рэсурсаў нацыянальнай і краязнаўчай бібліяграфіі);

– метадычнага і каардынацыйнага цэнтра (фарміруе агульную стратэгію краязнаўчай дзейнасці бібліятэк вобласці, арганізуе, каардынуе і метадычна забяспечвае гэту дзейнасць);

– навуковай установы (арганізуе і праводзіць даследаванні ў галіне бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства);

– удзельніка грамадскага краязнаўчага руху (узаемадзейнічае з краязнаўчымі аб’яднаннямі: таварыствамі, клубамі, краязнаўчымі музеямі, а таксама з асобнымі краязнаўцамі).

3.7. Цэнтральная бібліятэка раённай (гарадской) ЦБС узначальвае і вядзе краязнаўчую дзейнасць у межах свайго раёна, бібліятэкі-філіялы збіраюць і прадастаўляюць карыстальнікам матэрыялы пра тэрыторыі, якія яны абслугоўваюць.

3.8. Бібліятэкі асобных арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў збіраюць і ствараюць інфармацыю, звязаную з дзейнасцю гэтых арганізацый.

## ГЛАВА 4
## ФАРМІРАВАННЕ, АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗАХОЎВАННЕ ФОНДАЎ КРАЯЗНАЎЧЫХ І МЯСЦОВЫХ ДАКУМЕНТАЎ

4.1. Бібліятэчныя фонды краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў з’яўляюцца структурнымі часткамі агульнага фонду бібліятэкі, унікальнымі часткамі сукупнага нацыянальнага бібліятэчнага фонду. Фарміруюцца па прынцыпе максімальнай паўнаты з разлікам на актыўнае выкарыстанне і пастаяннае захоўванне.

4.2. У фонд краязнаўчых дакументаў уключаюцца:

апублікаваныя дакументы, як поўнасцю прысвечаныя рэгіёну (яго частцы), так і тыя, што ўтрымліваюць значныя па аб’ёме ці каштоўнасці звесткі аб ім, незалежна ад фізічнай формы (друкаваныя, электронныя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы і інш.), тыпу і віду, мовы, часу і месца выдання/стварэння, аўтарскай прыналежнасці, тыражу;

неапублікаваныя/непублікуемыя дакументы (рукапісы, калекцыі фотаздымкаў, зборы выяўленчых матэрыялаў, лісты, дзённікі і інш.);

электронныя копіі краязнаўчых дакументаў (створаныя ў мэтах забеспячэння захаванасці арыгіналаў або атрыманыя замест арыгіналаў);

сеткавыя электронныя краязнаўчыя дакументы.

4.3. У фонд мясцовых выданняў уключаюцца дакументы, выдадзеныя на тэрыторыі рэгіёна, незалежна ад зместу, фізічнай формы (друкаваныя, электронныя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы, мікрафільмы і мікрафішы), тыпу і віду, мовы і часу выдання.

4.4. У рабоце па фарміраванні фонда краязнаўчых і мясцовых дакументаў вылучаюцца наступныя працэсы: мадэляванне фонда, выяўленне, адбор і планамернае набыццё дакументаў для яго папаўнення, апрацоўка, улік, расстаноўка дакументаў, алічбоўка, забеспячэнне іх захаванасці.

4.5. Рэгіянальныя бібліятэкі ажыццяўляюць бягучае і рэтраспектыўнае камплектаванне фондаў краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, выкарыстоўваючы ў якасці крыніц: абавязковы экзэмпляр выданняў; дагаворы з мясцовымі выдавецкімі ўстановамі і арганізацыямі; падпіску; дары; кнігаабмен; унутрырэспубліканскае пераразмеркаванне дакументаў; закупку (у тым ліку на аўкцыёнах і ў прыватных асоб); алічбоўку; капіраванне і рэпрадуцыраванне экзэмпляраў дакументаў, якія адсутнічаюць ці маюцца ў недастатковай колькасці.

4.6. Рэгіянальныя бібліятэкі вядуць сістэматычную работу па выяўленні краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, выкарыстоўваючы для гэтага выдавецкую і кнігагандлёвую інфармацыю, бібліяграфічныя крыніцы, ЭІР іншых бібліятэк, інтэрнэт-сайты і інш.

4.7. У мэтах забеспячэння надзейнай захаванасці і рацыянальнага выкарыстання краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні вылучаюцца ў самастойныя падфонды асноўнага фонду бібліятэкі. Фонд краязнаўчых дакументаў (ці яго актыўная частка) можа знаходзіцца ў краязнаўчым падраздзяленні, а спецыялізаваныя часткі (спецвіды тэхнічнай літаратуры, нотныя, картаграфічныя, выяўленчыя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы, выдані на замежных мовах, рэдкія выданні, рукапісныя і архіўныя матэрыялы і г. д.) – у адпаведных падраздзяленнях.

4.8. Функцыі дэпазітарнага захоўвання краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў на тэрыторыі свайго краю выконваюць абласныя бібліятэкі. Дэпазітарны фонд краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў уключае ўсе дакументы незалежна ад крыніц паступлення, практычнай і навуковай каштоўнасці, запатрабаванасці карыстальнікамі і месца захоўвання ў бібліятэцы.

4.9. Краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні не могуць выключацца з дэпазітарнага фонду па прычыне маральнай састарэласці, наяўнасці перавыданняў, нізкага попыту. Асноўнай прычынай для спісання можа быць пашкоджанасць, дрэнны стан выданняў (толькі пры наяўнасці дастатковай колькасці экзэмпляраў і немэтазгоднасці рэстаўрацыі). Падставамі для выключэння з фонду залішне дублетных экзэмпляраў можа быць іх пераразмеркаванне або абмен.

4.10. Бібліятэкі распрацоўваюць і ажыццяўляюць меры па забеспячэнні захаванасці фондаў краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, якія прадугледжваюць:

кантроль умоў захавання і выкарыстання;

рэгулярнае абследаванне фізічнага стану (з выяўленнем экзэмпляраў, якія патрабуюць тэрміновай кансервацыі ці рэстаўрацыі, абмежаванага выкарыстання, першачарговага капіравання і пераводу на іншыя носьбіты інфармацыі);

рэгуляванне ўмоў прадастаўлення карыстальнікам унікальных (неапублікаваных, рэдкіх і тых, якія захоўваюцца ў бібліятэцы ў адзіным экзэмпляры) краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў;

планамернае стварэнне страхавых і архіўных копій.

## ГЛАВА 5
## ФАРМІРАВАННЕ І ВЫКАРЫСТАННЕ КРАЯЗНАЎЧАГА ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПАРАТА

5.1. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (далей − КДБА) уяўляе сабой спецыялізаваную частку даведачна-бібліяграфічнага апарата (далей − ДБА) рэгіянальнай бібліятэкі, скіраваную на максімальна поўнае раскрыццё складу і зместу краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў.

5.2. КДБА ўключае звесткі:

пра ўсе апублікаваныя краязнаўчыя дакументы (незалежна ад фізічнай формы, мовы, месца і часу выдання, ідэйнай накіраваннасці, наяўнасці ў бібліятэцы), а таксама аб усіх неапублікаваных/непублікуемых краязнаўчых дакументах, якія захоўваюцца ў фондах бібліятэкі;

пра ўсе мясцовыя выданні, незалежна ад фізічнай формы, зместу, часу стварэння і інш.

5.3. У склад КДБА могуць уваходзіць:

краязнаўчыя ЭІР;

карткавыя каталогі і картатэкі;

краязнаўчыя даведачныя і бібліяграфічныя выданні;

неапублікаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі, архіў выкананых даведак краязнаўчай тэматыкі.

5.4. Краязнаўчыя ЭІР прадстаўляюць сабой частку электроннага ДБА бібліятэкі.

5.4.1. Бібліятэкі ствараюць бібліяграфічныя, фактаграфічныя, паўнатэкставыя, камбінаваныя і іншыя рэсурсы краязнаўчага характару.

5.4.2. Універсальныя БД, у якіх адлюстроўваюцца звесткі пра краязнаўчыя і мясцовыя дакументы, з'яўляюцца часткай агульных ЭК рэгіянальных бібліятэк.

5.4.3. Зводныя масівы бібліяграфічнай інфармацыі пра краязнаўчыя і мясцовыя дакументы, якія фарміруюць бібліятэкі абласцей, адлюстроўваюцца ў рэгіянальных зводных электронных каталогах (далей – РЗЭК).

5.4.4. Акрамя ЭІР, якія фарміруюцца ў самой бібліятэцы, у склад КДБА ўваходзяць знешнія электронныя інфармацыйныя рэсурсы (выдавецтваў-агрэгатараў і іншых устаноў).

5.5. Фонд даведачных і бібліяграфічных выданняў уключае афіцыйныя, нарматыўныя, даведачныя (энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі) і бібліяграфічныя выданні ў друкаванай і электроннай формах.

5.6. Архіў выкананых даведак – частка КДБА, якая ўяўляе сабой збор выкананых раней пісьмовых бібліяграфічных даведак (перш за ўсё тэматычных). Гэта могуць быць копіі адказаў на складаныя разавыя запыты, якія патрабавалі бібліяграфічных пошукаў і кансультацый са спецыялістамі, а таксама копіі даведак па актуальных, неаднаразова паўтараемых запытах.

5.7. КДБА з'яўляецца адкрытым і агульнадаступным, у тым ліку для аддаленых карыстальнікаў. Бібліятэка павінна забяспечыць доступ у інтэрнэт-асяроддзі да тых элементаў КДБА, якія існуюць у электронным выглядзе, і прадугледзець паэтапны перавод у электронную форму астатніх элементаў (рэтраканверсія, алічбоўка і інш.).

5.8. Краязнаўчыя інфармацыйна-пошукавыя сістэмы, ствараемыя бібліятэкай, з'яўляюцца яе інтэлектуальнай уласнасцю.

## ГЛАВА 6
## КАТАЛАГІЗАЦЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫХ І МЯСЦОВЫХ ДАКУМЕНТАЎ. АДЛЮСТРАВАННЕ КРАЯЗНАЎЧАГА КАНТЭНТУ Ў СІСТЭМЕ КАРПАРАТЫЎНАЙ КАТАЛАГІЗАЦЫІ

6.1. Бібліятэкі ажыццяўляюць аналітыка-сінтэтычную перапрацоўку краязнаўчых і мясцовых дакументаў і адлюстроўваюць звесткі аб іх у сваіх лакальных ЭК.

6.2. Бібліяграфічныя запісы (далей – БЗ) на краязнаўчыя і мясцовыя дакументы ствараюцца ў разліку на іх далейшае прадстаўленне (пры дапамозе экспарту/імпарту) у рэгіянальных зводных электронных каталогах, ЭІР «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі», а таксама на іх удзел у рэгіянальным, нацыянальным, міжнародным інфармацыйным

абмене.

6.3. РЗЭКі разглядаюцца ў якасці зводных рэсурсаў краязнаўчых метаданых па сваёй вобласці. БЗ на нацыянальныя/краязнаўчыя дакументы, змешчаныя ў РЗЭКах, удзельнічаюць таксама ў агульнай пошукавай сістэме ЭІР «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі».

6.4. Абласная бібліятэка як базавая ў сваім рэгіёне (бібліятэка-агрэгатар) арганізоўвае і каардынуе работу бібліятэк – удзельніц абласнога РЗЭК, размяркоўвае абавязкі паміж бібліятэкамі ў мэтах рацыянальнага выкарыстання кадравых рэсурсаў і працоўнага часу, пазбягання дублетнасці.

6.5. Каардынацыя дзейнасці паміж удзельнікамі РЗЭК абласнога і раённага ўзроўняў можа быць у выглядзе размеркавання выданняў для аналітычнага роспісу (напрыклад, раённыя бібліятэкі распісваюць мясцовыя перыядычныя выданні, зборнікі і інш., абласная бібліятэка – рэспубліканскія і абласныя выданні). Тэхналогія размеркавання абавязкаў па фарміраванні РЗЭКаў можа будавацца і па іншых прынцыпах (вырашаецца ў кожнай вобласці самастойна).

6.6. БЗ на краязнаўчыя і мясцовыя дакументы павінны адпавядаць патрабаванням даступнасці, паўнаты і якасці, што забяспечваецца:

выкарыстаннем нацыянальнага камунікатыўнага фармату (BELMARC) ці аднаго з міжнародных фарматаў, што забяспечвае даступнасць інфармацыі для іншых бібліятэк і карыстальнікаў;

абавязковым апісаннем de visu дакументаў, месца захоўвання якіх вядома, выкарыстаннем для аналізу дакументаў дадатковых крыніц інфармацыі (пры неабходнасці);

паўнатой бібліяграфічнай характарыстыкі, г. зн. запаўненнем усіх палёў і падпалёў фармату са статусамі «абавязковы» і «ўмоўна абавязковы» ў адпаведнасці з патрабаваннямі дзеючых стандартаў і правілаў каталагізацыі;

стварэннем усіх неабходных кропак доступу на нацыянальныя/рэгіянальныя аб'екты;

глыбінёй сэнсавай апрацоўкі, складаннем максімальна поўных пошукавых вобразаў дакументаў;

абавязковасцю абазначэння месца захоўвання (установы, якая з'яўляецца ўласнікам дакумента), калі гэтыя звесткі вядомыя;

выкарыстаннем анатацыі ў выпадках невыразнай ідэнтыфікацыі дакумента як нацыянальнага/краязнаўчага.

6.7. Аптымальным лінгвістычным сродкам для працэсаў індэксавання дакументаў, арганізацыі фондаў, пошуку беларусазнаўчай і краязнаўчай інфармацыі, запазычвання БЗ у сістэме карпаратыўнай

каталагізацыі з’яўляецца Універсальная дзесятковая класіфікацыя (УДК) на беларускай мове.

6.8. Абавязковай з’яўляецца фіксацыя ў БЗ прыметы нацыянальнага дакумента (поле 615 са значэннем «Беларускі нацыянальны дакумент»). Для краязнаўчых дакументаў, выдадзеных за межамі Беларусі, поле пашыраецца дадатковым элементам – падполем $x (са значэннем «экстэрыёрыка»).

## ГЛАВА 7
## ПАДРЫХТОЎКА КРАЯЗНАЎЧАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАДУКЦЫІ

7.1. Бібліятэкі з’яўляюцца асноўнымі стваральнікамі, захавальнікамі і пастаўшчыкамі рэгіянальнай інфармацыі. Яны фарміруюць разнастайную прадукцыю (ЭІР, друкаваныя выданні, віртуальныя праекты, лічбавыя калекцыі, неапублікаваныя інфармацыйныя матэрыялы і інш.), прызначаную для задавальнення найбольш значных і ўстойлівых патрэб грамадства ў інфармацыі аб рэгіёнах і мясцовасцях.

7.2. Непасрэдную дзейнасць па стварэнні краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі мэтазгодна пачынаць з вывучэння інфармацыйных запатрабаванняў карыстальнікаў, распрацоўкі рэпертуару прадукцыі (з улікам магчымасцяў кааперацыі і каардынацыі з бібліятэкамі і іншымі ўстановамі).

7.3. Абласная бібліятэка каардынуе дзейнасць іншых бібліятэк і небібліятэчных устаноў вобласці па стварэнні краязнаўчых ЭІР, бібліяграфічных выданняў; распрацоўвае методыку фарміравання краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі; аказвае метадычную і кансультацыйную дапамогу па гэтых пытаннях.

7.4. Бібліяграфічная прадукцыя рэгіянальных бібліятэк складаецца з двух блокаў:

бібліяграфічныя дапаможнікі, прысвечаныя краю: друкаваныя, рукапісныя, электронныя, інтэграваныя; навукова-дапаможныя, рэкамендацыйныя; бягучыя, рэтраспектыўныя; універсальныя, галіновыя, тэматычныя, персанальныя і інш.;

бібліяграфічныя дапаможнікі мясцовых выданняў (бібліяграфічныя рэпертуары ці зводныя рэтраспектыўныя каталогі мясцовых выданняў, бягучыя паказальнікі мясцовых выданняў, паказальнікі зместу перыядычных выданняў і выданняў з працягам і інш.).

7.5. У працэсе краязнаўчай дзейнасці бібліятэкамі ствараюцца фактаграфічныя інфармацыйныя прадукты: календары знамянальных і

памятных дат, хронікі падзей, папулярныя энцыклапедыі, біяграфічныя даведнікі, аналітычныя агляды і да т. п.

7.6. З мэтай папаўнення краязнаўчых фондаў і павышэння даступнасці краязнаўчай інфармацыі бібліятэкі могуць перавыдаваць найбольш каштоўныя і рэдкія краязнаўчыя выданні.

7.7. Да краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі адносяцца і неапублікаваныя матэрыялы, збіраемыя/ствараемыя бібліятэкамі: рукапісныя, выяўленчыя, фотаальбомы, тэматычныя падборкі выразак і копій артыкулаў з перыёдыкі і фрагментаў кніг, аўдыявідэазапісы з сюжэтамі аб мясцовых падзеях, гісторыка-культурнай спадчыне рэгіёна або населенага пункта, знакамітых і таленавітых жыхарах, турыстычных магчымасцях і г. д.

7.8. Прыярытэтным напрамкам з'яўляецца фарміраванне краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі ў лічбавым асяроддзі. Віды краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі ў электронным выглядзе: базы даных, сайты, віртуальныя выставы і праекты, мультымедыйныя выданні, прэзентацыі, аўдыявізуальныя матэрыялы, буктрэйлеры, блогі, навігатары па краязнаўчых рэсурсах, віртуальныя экскурсіі, падарожжы, анлайн-музеі, гістарычныя, літаратурныя анлайн-карты, інтэрактыўныя рэсурсы (віктарыны, квесты, анлайн-гульні) і інш.

## ГЛАВА 8
## БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ

8.1. Аператыўнае і камфортнае бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне чытачоў бібліятэкі і аддаленых карыстальнікаў з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

8.2. Бібліятэка прадастаўляе доступ да ўсіх краязнаўчых і мясцовых дакументаў, якія захоўвае ў сваіх фондах. Выдача краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў ажыццяўляецца згодна агульным правілам карыстання бібліятэкай, якія дзейнічаюць у канкрэтнай бібліятэцы.

8.3. Краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні, якія маюцца ў бібліятэцы ў адзіным экзэмпляры, выдаюцца для азнаямлення карыстальнікам толькі ў межах бібліятэкі. Бібліятэка мае права ў мэтах забеспячэння захаванасці прадастаўляць карыстальнікам копіі на папяровых, электронных ці іншых носьбітах.

8.4. Краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні выдаюцца па МБА ў іншыя бібліятэкі, за выключэннем адзіных экзэмпляраў, замест якіх высылаюцца копіі. Па запытах іншых бібліятэк і аддаленых

карыстальнікаў копіі краязнаўчых і мясцовых дакументаў могуць дасылацца праз электронную дастаўку.

8.5. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўчых запытах ажыццяўляецца з выкарыстаннем усяго ДБА бібліятэкі, у першую чаргу, яго краязнаўчай часткі. Даведачна-бібліяграфічнае і кансультацыйнае абслугоўванне аддаленых карыстальнікаў ажыццяўляецца з дапамогай віртуальнай даведачнай службы, электроннай пошты, праз тэлефонную сувязь, сацыяльныя сеткі і г. д.

8.6. Бібліятэкі сістэматычна вядуць бібліяграфічнае інфармаванне аб краязнаўчых дакументах, што паступілі ў іх фонды або фонды іншых бібліятэк рэгіёна. Інфармаванне можа быць як масавым (на сайце бібліятэкі, у СМІ і інш.), так і індывідуальным або групавым (у адпаведнасці з канкрэтнымі краязнаўчымі бібліяграфічнымі запытамі асобных чытачоў ці калектываў).

## ГЛАВА 9
## МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

9.1. Метадычнае кіраўніцтва краязнаўчай дзейнасцю бібліятэк краіны ажыццяўляе Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Гэту задачу выконваюць розныя структурныя падраздзяленні бібліятэкі ў межах сваіх паўнамоцтваў.

9.1.1. У структуры навукова-даследчага аддзела бібліяграфіі функцыянуе спецыялізаванае падраздзяленне – сектар краязнаўства і праектнай работы. Асноўнымі яго задачамі як метадычнага цэнтра з’яўляюцца: аналіз краязнаўчай дзейнасці рэгіянальных бібліятэк; распрацоўка рэгламентуючых дакументаў і метадычных дапаможнікаў па краязнаўчай бібліяграфіі; падрыхтоўка аглядаў краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі рэгіянальных бібліятэк; удзел у стварэнні краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі; кансультацыйная дапамога рэгіянальным бібліятэкам; правядзенне семінараў, канферэнцый, круглых сталоў па пытаннях бібліятэчнага краязнаўства.

9.2. Метадычнае кіраўніцтва краязнаўчай дзейнасцю бібліятэк вобласці ажыццяўляе абласная бібліятэка. Яна адказвае за стан краязнаўчай дзейнасці публічных бібліятэк і ў пэўнай ступені іншых бібліятэк рэгіёна, незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці. Цэнтральная раённая бібліятэка аказвае метадычную, інфармацыйную і кансультацыйную дапамогу бібліятэкам ЦБС.

9.3. У якасці метадычнага цэнтра абласная бібліятэка:

выучае стан краязнаўчай дзейнасці бібліятэк вобласці па ўсіх кірунках;

рыхтуе метадычныя матэрыялы ў дапамогу краязнаўчай бібліятэчнай дзейнасці, агляды практычнага вопыту, аналітычныя справаздачы і даведкі;

аказвае кансультацыйную і метадычную дапамогу, спрыяе ўкараненню ў бібліятэках рацыянальных і эфектыўных форм і метадаў працы;

арганізуе павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў краязнаўчых падраздзяленняў бібліятэк вобласці: праводзіць адукацыйныя семінары, практыкумы, школы перадавога вопыту, стажыроўкі і інш.;

садзейнічае прафесійным зносінам спецыялістаў шляхам арганізацыі семінараў, канферэнцый, круглых сталоў і г.д.

## ГЛАВА 10
## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ І ПРАЕКТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

10.1. Навуковымі даследаваннямі ў галіне краязнаўства займаюцца бібліятэкі рознага ўзроўню, тыпаў і відаў у адпаведнасці з іх профілем і напрамкамі дзейнасці. НББ рэалізуе шэраг навукова-даследчых і выдавецкіх праектаў, прысвечаных рэгіянальнай гісторыі і дакументнай спадчыне рэгіёнаў. Навукова-даследчы характар носіць праца, звязаная з пошукам, выяўленнем, зборам нацыянальных і краязнаўчых дакументаў, ліквідаваннем лакун нацыянальнай бібліяграфіі і да т. п.

10.2. Краязнаўчыя даследаванні бібліятэк уносяць уклад у развіццё гісторыі, крыніцазнаўства, краязнаўства, этнаграфіі, літаратуразнаўства, кнігазнаўства, геаграфіі, бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і іншых напрамкаў. Праектная дзейнасць дае магчымасць пашырэння функцый бібліятэк, рэалізацыі асветніцкіх задач, актывізацыі дабрачыннай дзейнасці.

10.3. Абласная бібліятэка вядзе самастойныя даследчыя праекты ў галіне краязнаўства, арганізуе цэнтралізаваныя даследаванні ў бібліятэках вобласці, удзельнічае ў даследаваннях, якія арганізуюць іншыя установы свайго або іншых рэгіёнаў, а таксама ў міжнародных праектах (у першую чаргу, у рамках памежнага і трансмежнага супрацоўніцтва).

10.4. Навукова-даследчая работа (далей − НДР) абласных бібліятэк можа весціся па наступных кірунках: вывучэнне карыстальнікаў і іх патрэб у краязнаўчай інфармацыі; вывучэнне гісторыі і сучаснай практыкі краязнаўчай бібліятэчнай дзейнасці; вывучэнне кніжных

фондаў і калекцый краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў; гісторыка-краязнаўчыя даследаванні (гісторыя краязнаўчай дзейнасці, гісторыя бібліятэк і кніжнай справы ў вобласці) і інш.

10.5. Абласныя бібліятэкі ўдзельнічаюць таксама ў даследаваннях па гісторыі самой вобласці, яе асобных тэрыторый і населеных месц, па абласной біяграфіцы і генеалогіі і г.д. Да ліку важных відаў НДР адносіцца падрыхтоўка навукова-дапаможнай бібліяграфічнай прадукцыі.

10.6. Навукова-даследчая дзейнасць публічных бібліятэк у галіне краязнаўства мае практычную скіраванасць і абапіраецца на тыя крыніцы, якія збіраюцца, ствараюцца самой бібліятэкай або да якіх яна мае доступ. Да асноўных тэматычных напрамкаў адносяцца: гісторыя населеных пунктаў, змены адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення; мясцовыя тапонімы; хронікі падзей; гісторыя ўстаноў і прадпрыемстваў; біяграфічныя звесткі пра дзеячаў края; генеалогія і гісторыя сем’яў; помнікі прыроды, архітэктуры, гісторыі і культуры; мясцовы фальклор, промыслы і рамёствы, абрады і звычаі мясцовага насельніцтва; гісторыя і змест найбольш значных краязнаўчых выданняў і інш.

10.7. Вынікі навукова-даследчай дзейнасці бібліятэк прадстаўляюцца ў выглядзе дакладаў і паведамленняў на навукова-практычных канферэнцыях, чытаннях, семінарах, публікуюцца як асобна, так і ў прафесійных друкаваных і электронных выданнях, а таксама размяшчаюцца ў інтэрнэце.

## ГЛАВА 11
## СУПРАЦОЎНІЦТВА БІБЛІЯТЭК З ІНШЫМІ ЎСТАНОВАМІ КУЛЬТУРЫ, НАВУКІ, АДУКАЦЫІ, ПРЫВАТНЫМІ АСОБАМІ

11.1. Бібліятэкі вядуць краязнаўчую работу ў супрацоўніцтве і каардынацыі з іншымі арганізацыямі, дзейнасць якіх пэўным чынам звязана з краязнаўствам. Бібліятэка павінна выконваць вядучую ролю ў каардынацыі ўзаемадзеяння інстытутаў сацыяльнай памяці, выступаць ініцыятарам і галоўным удзельнікам карпаратыўнага супрацоўніцтва ў галіне краязнаўства.

11.2. Праблематыка сучаснага беларускага краязнаўства распрацоўваецца шэрагам навуковых і адукацыйных устаноў краіны, у тым ліку ўстановамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Інстытут гісторыі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры). Краязнаўчыя напрамкі з’яўляюцца прыярытэтнымі ў дзейнасці рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднанняў – Беларускага фонду культуры,

Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускага таварыства аховы прыроды і інш.

11.3. Комплексныя веды аб малой радзіме генерыруюцца індывідуальнымі і калектыўнымі, прафесійнымі і аматарскімі суб’ектамі краязнаўчага руху. Сярод краязнаўчых арганізацый вылучаюцца навуковыя і навукова-асветныя таварыствы, краязнаўчыя арганізацыі пры ўстановах, гісторыка-краязнаўчыя цэнтры, клубы і інш.

11.4. Бібліятэкі ажыццяўляюць узаемадзеянне з іншымі ўстановамі, што знаходзяцца на тэрыторыі рэгіёна: музеямі, архівамі, інспекцыямі і аддзеламі па ахове аб’ектаў культурнай спадчыны, арганізацыямі навукі і адукацыі, грамадскімі таварыствамі, выдавецтвамі, краязнаўцамі-аматарамі.

11.5. Супрацоўніцтва бібліятэк з музеямі, архівамі, навучальнымі ўстановамі, краязнаўчымі таварыствамі можа быць у выглядзе: сумесных навуковых і выдавецкіх праектаў, мерапрыемстваў і конкурсаў; стварэння сумеснымі намаганнямі поўнамаштабных краязнаўчых рэсурсаў; доступу да перыядычных выданняў і іншых дакументаў для іх алічбоўкі; стварэння пры бібліятэках валанцёрскіх груп, якія ажыццяўляюць пошукава-даследчую дзейнасць.

11.6. Перспектыўны напрамак супрацоўніцтва рэгіянальных бібліятэк з музейнымі, архіўнымі і іншымі ўстановамі, што знаходзяцца на тэрыторыі рэгіёна, – наладжванне ўзаемадзеяння па пошуку, выяўленні нацыянальных і краязнаўчых дакументаў у фондах гэтых устаноў і ўвядзенні інфармацыі ў навуковы абарот.

11.7. Бібліятэкі ўдзельнічаюць у пошуку і далучэнні да супрацоўніцтва асоб, якія займаюцца краязнаўчай дзейнасцю, з’яўляюцца носьбітамі краязнаўчай інфармацыі або захоўваюць матэрыялы краязнаўчага характару (афіцыйныя дакументы, фотаздымкі, рукапісы і інш.), арганізоўваюць збор успамінаў і да т. п.

11.8. Бібліятэкі, у першую чаргу тыя, што знаходзяцца на тэрыторыях, якія маюць цесныя гістарычныя, культурныя, роднасныя сувязі з суседнімі тэрыторыямі замежных краін, ажыццяўляюць міжнароднае супрацоўніцтва па розных напрамках, у тым ліку ў галіне краязнаўства.

## ГЛАВА 12
## РАСПАЎСЮДЖВАННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫХ ВЕДАЎ

12.1. Распаўсюджванне краязнаўчых ведаў праводзіцца

сістэматычна, адлюстроўваецца ў планах работы бібліятэк і ажыццяўляецца ў цеснай сувязі з грамадскімі, навуковымі, дзяржаўнымі арганізацыямі і ўстановамі, якія займаюцца краязнаўчай работай.

12.2. Бібліятэкі вядуць планамерную і мэтанакіраваную работу па распаўсюджванні і папулярызацыі ведаў аб мясцовасцях і населеных пунктах і фарміраванні патрэб у краязнаўчай інфармацыі. Гэта дзейнасць ажыццяўляецца па некалькіх асноўных накірунках:

арганізацыя і правядзенне экскурсій, прэзентацый, навуковых і сацыякультурных мерапрыемстваў, гуртковай, клубнай работы;

падрыхтоўка і публікацыя навуковых, даведачных, папулярных краязнаўчых матэрыялаў;

стварэнне разнастайных электронных інфармацыйных рэсурсаў краязнаўчай тэматыкі;

стварэнне камфортнага інфармацыйнага асяроддзя, якое забяспечвае магчымасць самастойнага атрымання краязнаўчай інфармацыі ў аддаленым доступе;

стварэнне груп у сацыяльных сетках, дзякуючы якім краязнаўчая інфармацыя, вынікі краязнаўчай дзейнасці становяцца даступнымі больш шырокаму колу зацікаўленых карыстальнікаў.

12.3. Бібліятэчныя ўстановы праводзяць навуковыя канферэнцыі, семінары, краязнаўчыя чытанні, круглыя сталы (у тым ліку міжнародныя). Даклады, выстаўкі, экскурсіі, прэзентацыі, якія арганізоўваюцца ў час правядзення канферэнцый, павінны спрыяць раскрыццю бібліятэчных фондаў, распаўсюджванню вынікаў даследаванняў, вяртанню з небыцця імён, абуджэнню інтарэсу да мясцовай гісторыі.

12.4. Сярод сацыякультурных мерапрыемстваў краязнаўчага характару – выстаўкі-агляды краязнаўчай літаратуры, сустрэчы з краязнаўцамі і аўтарамі кніг, краязнаўчыя падарожжы (у тым ліку віртуальныя), экскурсы ў гісторыю краю, пазнавальныя вечары, віктарыны-ўспаміны, квэсты, эколага-краязнаўчыя гульні і інш.

12.5. Бібліятэкі самастойна або ў супрацоўніцтве з іншымі арганізацыямі рэалізуюць выдавецкія праекты (выпускаюць кнігі краязнаўчай тэматыкі, электронныя выданні, навуковыя зборнікі, матэрыялы навуковых канферэнцый і чытанняў, часопісы, газеты, хрэстаматыі, папулярныя энцыклапедыі, даведнікі, краязнаўчыя календары, хронікі, летапісы падзей, альманахі, фотаальбомы, камплекты паштовак і інш.).

12.6. Бібліятэкі супрацоўнічаюць са СМІ, публікуюць інфармацыю пра свае інфармацыйныя рэсурсы, паслугі, акцыі і мерапрыемствы

краязнаўчага характару.

12.7. З мэтай папулярызацыі краязнаўчых ведаў бібліятэкі ствараюць музеі/музейныя куткі, выставы, літаратурныя, мемарыяльныя кабінеты і да т.п.

12.8. Краязнаўчую інфармацыю рэгіянальныя бібліятэкі прадстаўляюць у спецыялізаваных раздзелах (рубрыках) сайтаў/парталаў і прадастаўляюць свабодны доступ да яе. На бібліятэчных сайтах размяшчаюцца краязнаўчыя базы даных, электронныя калекцыі, віртуальныя выстаўкі, алічбаваныя выданні краязнаўчага зместу, выпускі календароў знамянальных і памятных дат, матэрыялы пра славутых землякоў і іншая карысная інфармацыя, звязаная з канкрэтным рэгіёнам.

12.9. Павышэнне даступнасці інфармацыі (у тым ліку краязнаўчай) на бібліятэчных сайтах дасягаецца шляхам стварэння і падтрымкі мабільных версій і мабільных дадаткаў; шматмоўных інтэрфейсаў; версій для людзей з абмежаванымі магчымасцямі па зроку і інш.